ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 145 (1414) ПЯТНІЦА, 26 чэрвеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.
Кошт асобнага №—2 кап.

ЛАНЦУГІ ГУВЭРА—НА ПАДМАЦАВАНЬНЕ ЮНГАУСКІХ

Соцыял-дэмократы зацяваюць кампанію ашуканьня рабочых

Новыя зьвеньні наступу на комуністычны друк

Рэформістыя ілжэ-кампаніяй імкнуцца „супакоіць“ радавых членаў с-д партыі

БЭРЛІН, 24.— Ад імя прэзыдыуму с.-д. фракцыі рэйхстагу, Брэйтшэйд накіраваў рэйхсканцлеру Брунінгу ліст з патрабаваньнем паскорыць перамовы аб зьмене некаторых пастаноў надзвычайнага дэкрэту ўраду, спасылаючыся пры гэтым на новае становішча, створанае прапановай Гувэра аб адтэрміноўцы плацяжоў на год.

Гэты акт с.-д. фракцыі зьяўляецца пацьверджаньнем учарайшага паведамленьня „Бэрлінэр Тагеблят“, аб тым, што рэфармістыя пад націскам мас, мобілізацыя якіх праводзіцца рэволюцыйнай профопозыцыяй, маюць намер паскорыць сваю ілжэ-кампанію пад лёзунгам унясеньня зьмен у надзвычайны дэкрэт.

Гэта ілжэ-кампанія павінна супакоіць масу радавых членаў с.-д. партыі і рэформісцкіх профсаюзаў, сярод якіх расьце нездавальненьне політыкай простага падтрыманьня ўраду Брунінга кіраўнікамі с.-д. партыі і рэформісцкіх профсаюзаў. „Форвэртс“ вельмі нездаволены тым, што „Тагеблят“ раскрыў учора карты рэформісцкіх профбюрократаў і ўпікае гэтую газэту ў тым, што яна „стварае рэкляму“ для рэволюцыйнай профопозыцыі.

„Маладая Гвардыя“ забаронена на 4 тыдні

БЭРЛІН.—Соц. дэмократ Гржэзінскі забараніў орган нямецкага комсамолу „Маладая Гвардыя“ на 4 тыдні, да 23 ліпеня. Гэта забарона зьяўляецца часткай агульнага наступленьня на комуністычны друк, і ў прыватнасьці мае мэтай перашкодзіць кампаніі нямецкага комсамолу за ператварэньне газэты „Маладая Гвардыя“ (выходзіць у Бэрліне 3 разы на тыдзень)—у штодзённы орган рабочае моладзі.



Агітгрупа Гамбургскай арганізацыі компартыі Нямеччыны на вуліцы ў часе работы

ФІНСКІ ЎРАД ПАКРЫВАЕ АНТЫ-САВЕЦКІЯ ВЫПАДЫ ФАШЫСТЫХ

Паведамленьне ТАСС

4-га чэрвеня г. г. фінляндзкі паверэны ў справах у Маскве пераслаў Народнаму Камісарыяту Замежных спраў ноту, якая зьяўлялася адказам на вядомую ноту Саюзнага ўраду ад 17-га і 24-га мая г. г.

У гэтай ноце паведамлялася, што нота Саюзнага ўраду ад 24 мая не зьмяніла поглядаў ураду Фінляндыі па даных у ноце апошняга ад 16 мая. Што-ж датычыць ноты Саюзнага ўраду ад 17 мая, дык у сваім адказе фінляндзкі ўрад не закранае сутнасьці тых фактаў, якія адзначаны ў ноце Саюзнага ўраду і якія паслужылі ўраду СССР асновай для протэсту. Фінляндзкі ўрад не выяўляе сваіх адносін да прыведзеных у савецкай ноце праяў антысавецкай кампаніі, у тым ліку і да пропаганды, якая вядзецца ў Фінляндыі за адарваньне ад Савецкага Саюзу некаторых яго частак. Фінляндзкі ўрад абмяжоўваецца цьверджаньнем, што адзначаныя ў ноце Савецкага ўраду ад 17 мая абвінавачаньні часамі ня маюць падставы, а часамі лёна ґрунтуюцца на няпэўных або перапавалічаньнях.

У ноце адзначаецца, што фінляндзкі ўрад „чым-небудзь садзейнічаў няспрыяючаму развіцьцю адносін абедзьвюх краін“. І паказваецца на тое, што далейшы абмен нотамі па пытаньнях, закранутых у ноце Саюзнага ўраду, ня можа прывесьці, на думку ўраду Фінляндыі, да сур'ёзных вынікаў.

Адказ ураду СССР

У адказ на гэту ноту, пам. наркома замежных спраў т. Крэсьцінскі 22 чэрвеня г. г. адправіў паверанаму па справах Фінляндыі ў Маскве ноту наступнага зьместу.

* * *

„Пан паверэны ў справах! Саюзны ўрад констатуе, на падставе Вашай ноты, што фінляндзкі ўрад, ня гледзячы на протэсты саюзнага ўраду, заяўленыя ў вядомых нотах наркома замежных спраў, застаецца пры сваіх поглядах на пытаньні, якія служылі прадметам апошняй перапіскі паміж абодвума ўрадамі і, значыцца, будзе і надалей патураць той кампаніі варожасьці і нянавісьці, якая ўжо на працягу доўгага часу вядзецца ў Фінляндыі супроць Савецкага Саюзу, і якая зьяўляецца пагрозай для існуючых адносін паміж абедзьвюма дзяржавамі. Саюзны ўрад вымушан у сувязі з гэтым зрабіць вывад, што тым самым адказнасьць за вынікі, якія вынікаюць з цяперашняга становішча, цалкам кладзецца на фінляндзкі ўрад

Спартакіяда павінна быць!

У пачатку ліпеня 1931 г. (4-12) у Бэрліне павінна адбыцца спартакіяда організацый, якія ўваходзяць у Чырвоны Спортыўны Інтэрнацыянал.

За 10 год Чырвоны Спортыўны Інтэрн. зьявіў сабраў пад сваімі баявымі сьцягамі звыш 46 мільёнаў рабочых і сялянскіх чырвоных спортсмэнаў. Уся дзейнасьць ЧСІ была накіравана на практычнае ажыцьцяўленьне лініі комуністычных партый і Комінтэрну. У гэтым увесь сэкрэт такога посьпеху міжнароднага чырвонага фізкультурнага руху.

Акрамя гэтага, усімі мерапрыемствамі спартакіяда мяркуе ахапіць звыш 110 тыс. рэволюцыйных спортсмэнаў. Па свайму зьместу спартакіяда зьяўляецца праверкай усебаковай падрыхтаванасьці рэволюцыйных спортсмэнаў да будучых боек за дыктатуру пролетарыяту.

Ужо на працягу некалькіх месяцаў ва ўсім сьвеце, у прыватнасьці ў Савецкім Саюзе і Беларусі, разгарнулася шырокая падрыхтоўчая праца да спартакіяды. Праведзены адборачныя спаборніцтвы, сабраны тысячы рублёў у фонд ЧСІ і Бэрлінскай спартакіяды. 19-га чэрвеня закончыліся ўсесаюзныя адборачныя спаборніцтвы, у колектыў СССР увайшлі лепшыя фізкультурнікі і ўдарнікі з вынікамі, дасягаючымі сусьветных рэкордаў.

Бэрлінская спартакіяда ўнесла вялікае ажыўленьне ў спортыўную работу ФК організацый БССР. Аб гэтым сьведчыць разгортваньне здачы норм на значок „Гатоў да працы і абароны“ шырокая хваля інтэрнацыянальных мерапрыемстваў.

І не выпадкова, што капіталістычная прэса падняла вой вакол пагроз, якімі багата чырвоная спартакіяда для ўсяго капіталізму.

Газэта „Дэйтшэ-Альгемэйнэ Цайтунг“ піша:

„Роспач і злаба растуць. Комунізм вярбуе новыя масы прыхільнікаў з ахвяр няволі.

Адказнасьць захоўваючых парадак і супакой надзвычайна растуць. Чаму не забараняюць спартакіяду, якая абяцае стаць пад маскай спортыўнага сьвята вялікім пропагандыцкім парадам бальшавізму?“

Усьлед за газэтай соцыял-фашысты—першым крокам у выкананьні волі капіталу—забаранілі скарыстаньне для спартакіяды гарадзкіх стадыёнаў, клюбаў і пляцовак у Бэрліне.

І калі соцыял-паліцэйскі Гржэзінскі ўбачыў, што гэта забарона не спыніла падрыхтоўкі спартакіяды і ўзятых тэмпаў, ён пайшоў далей—забараніў усю Бэрлінскую спартакіяду. Бэрлінская спартакіяда павінна быць. Гэта справа—пролетарыяту. І толькі пролетарыят мае права рашаць гэта пытаньне.

З атрыманьнем паведамленьня аб забароне спартакіяды, па г. Менску пракацілася шырокая хваля протэстаў рабочых фізкультурнікаў.

Паступаюць паведамленьні з раёнаў БССР аб патрабаваньні адмены забароны і прадстаўленьня для спартакіяды ўсіх стадыёнаў, пляцовак, водных станцый, клюбаў Бэрліну, дазволу на ўдзел у спартакіядзе савецкіх фізкультурнікаў.

У адказ на забарону чырвоныя фізкультурнікі яшчэ шчыльней самкнуць свае рады пад сьцягам Комінтэрну.

Савецкія фізкультурнікі, вышэй тэмпы ў барацьбе за пяцігоўку ў 4 гады!

М. Д. Архіпенкаў

Карныя экспэдыцыі супроць паўстанцаў

ТОКІО, 22.—Па паведамленьню з Харбіна, паўстаўшыя сяляне Гірынскай провінцыі скасавалі арэндныя дагаворы, напалі на памяшканьні ўраду і забілі з ліку адміністрацыйных асоб. У провінцыю паслана карная экспэдыцыя для задушэньня паўстаньня.

Да 1 ліпеня рэалізаваць пазыку

ПРЫКЛАД ГОМЕЛЯ—буксір для Менску, Мазыра і Барысава

Рад комсамольскіх організацый яшчэ ня выканаў рашэньняў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ:—„Кожны комсамолец дасьць шэсьць падпісчыкаў“

Трымайце раўненьне па комсамольцам Школьнік і Аўчук

Прэміі за ўдарную працу

ГОМЕЛЬ, 25 (БЕЛТА). За датэрміновую рэалізацыю пазыкі „3-га рашаючага“ звыш месячнага заработку і добрае правядзеньне барацьбы за фінплян, прэміяваны завод імя Ланцуцкага сьцягам гаркому, завод „Комінтэрн“—сьцягам гарсавету, завод Сельмаш—сьцягам гарпрофсавету, фабрыка „Пролетарскі Шлях“ прэміявана 500 руб. за культработу, „Колектыўная Праца“—300 руб. Завод „Чырвоны Хэмік“—200 рублёў, завод „Пролетары“ атрымаў сьцяг ЦК КП(б)Б па конкурсу на лепшае прадпрыемства, Палесдрук атрымаў сьцяг ЦК саюзу. Рабочыя гэтых заводаў апраўдалі свае ўзнагароды і прэміяваны зараз на 750 руб. за культработу. Гарком КП(б)Б, ГСПС, гарсавет прэміявалі рэдакцыю „Палескай Праўды“, адзначаючы асаблівую работу па мобілізацыі мас на хутчэйшую рэалізацыю пазыкі.

Марудныя тэмпы ў Барысаве

Барысаў. (Наш кор.) Рэалізацыя пазыкі ў Барысаве праходзіць марудным тэмпамі. На 19-е чэрвеня процант рэалізацыі пазыкі па горадзе складае 69,2 проц. „Чырвоная Бярэзіна“ выкавала кантрольную лічбу на 33 проц., „Комінтэрн“—на 48 проц.

Паасобныя комсамольскія ячэйкі ўзялі бальшавіцкія тэмпы ў рэалізацыі пазыкі. Так, ячэйка ЛКСМБ электрастанцыі падпісалася на 100 проц. месячнага заработку і ўзяла на буксір скрыначна-этыковачны цэх „Чырвонай Бярэзіны“.

Комуна аўтоматычнага цэху фабрыкі „Пролетарская перамога“ падпісалася на 100 проц.

Комсамолец-фабзавуч Аўчук падпісаўся на 300 проц. свайго месячнага заработку. Комсамолец Школьнік (ячэйка комбінату) атрымлівае пэнсію 40 руб. у месяц, падпісаўся на 200 проц. Кугель.

Ліквідаваць запазычанасьць

Комсамольскі колектыў Рагачэўскага педтэхнікуму абгаварыўшы пытаньне аб выпуску пазыкі трэцяга рашаючага, абавязваецца:

Ліквідаваць усю запазычанасьць па членскіх узносах у спажывецкае таварыства. На 100 проц. ахапіць падпіскай на пазыку трэцяга рашаючага.

В. Семянчукоў.

* * *

Конферэнцыя колгаснай моладзі Сярэднякоўскага сельсавету ўхваліла падпісацца на пазыку „3-га рашаючага“ у памеры месячнага заработку.

Брыгада „Ч. З.“ Рудзько Кутнер.

У калёне адстаючых

Мозыр, 24. (Белта).—Культмасавая праца па распаўсюджваньні пазыкі разгорнута недастаткова. Распаўсюджваньне пазыкі па раёне дасягнула толькі 50 проц. На горадзе, пры заданьні ў 330 тысяч рублёў, падпіска праведзена на 160 тысяч.

Уперадзе па распаўсюджваньню пазыкі ідзе Баліцкаўскі завод чыгункі, які пераўзышоў заданьне ў 52.550 руб., падпісаўшыся на 66 365 руб.

Да распаўсюджваньня пазыкі прыступілі колгасы раёну. Сельсаветы не разгарнулі ніякай растлумачальнай працы аб пазыцы за выключэньнем толькі Бабрынецкага сельсавету.

Пасты і дазоры даносяць:

Комсамольская ячэйка колгасу „Серп“, Смілавіцкага раёну, агульным сходам падпісалася на 100 проц. месячнага заработку, а таксама колектыўна—на 100 руб. облігацыю і абавязалася распаўсюдзіць пазыку сярод насельніцтва на 300 руб.

Ячэйка выклікала на соцспаборніцтва комсамольскую ячэйку колгасу „Чырвоны Профінтэрн“. Германовіч В. С.

— Усе комсамольцы Полацкага лясного тэхнікуму падпісаліся на 130 пр. сваёй стыпэндыі, а нестыпэндыяты ня менш 25 руб. кожны. Разгорнута работа па рэалізацыі рашэньняў ЦК УсеЛКСМ аб вярбоўцы 6 падпісчыкаў кожным комсамольцам.

Ячэйка выклікала ўсе навучальныя ўстановы Полацку.

Пост „Ч. З.“ Д. Піскун.

— Студэнты 3-га курсу Індустрыяльна-пэдагогічнага інструктарскага тэхнікуму падпісаліся на 130 проц. месячнай стыпэндыі, што складае 6920 руб.

Студэнты выклікалі насьледваць іх прыкладу Гомельскі індустрыяльна-інструктарскі тэхнікум. Ф. Хайтман.

— На 100 проц. свайго месячнага заработку падпісаліся дэлегаты Высачанскай раённай настаўніцкай конферэнцыі. Калінаў

— Усе студэнты Бабруйскага рабфаку падпісаліся на пазыку „3-га рашаючага“ на суму 6600 руб., што складае 25 проц. месячнай стыпэндыі. Некаторыя студэнты-комсамольцы, як Бондар В., Касьцюкевіч А., Ашаровіч і інш., падпісаліся на 200 проц. стыпэндыі. Касьцюкевіч.

Віцебск. Рабочыя махорачнай фабрыкі цалкам падпісаліся на пазыку „3-га рашаючага“, на месячны заработак. Ударнікі, т. т. Ходзік і Вілак, падпісаліся на 6-тыднёвы заработак.

Сход жанчын, членаў гарсавету, у колькасьці 225 чалавек абвясьціў сябе ўдарным у правядзеньні падпіскі на пазыку. Усе жанчыны падпісваюцца на месячны заработак.

НАСУСТРАЧ ГЕНЭРАЛЬНАМУ

СКЛАДАЦЬ ГЕНПЛЯН ПАВІННЫ МІЛЬЁНЫ

27 чэрвеня выйдзе спэцыяльны нумар газэты „Чырвоная Зьмена“,

ПРЫСЬВЕЧАНЫ

РАСПРАЦОЎЦЫ ГЕНЭРАЛЬНАГА ПЛЯНУ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ БССР.

РЫХТУЙЦЕСЯ да спэцыяльнага нумару, арганізуйце колектыўную і прапрацоўку матар'ялаў ПАДПІСКУ

У другой палове ліпеня—другі ўсебеларускі піонэрскі зьлёт

ШЫРЭЙ ПАДРЫХТОЎКУ

Па-ўдарнаму правесьці райзьлёты, рыхтавацца да ўсебеларускага

ДАБІЦЦА РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ

Гэтымі днямі за подпісам начальніка штабу другога Ўсебеларускага зьлёту піонэраў і ЦК ЛКСМБ тав. Гайдукевіча абвешчаны загад, у якім гаворыцца: „Ход падрыхтоўкі піонэрорганізацыі да Ўсебеларускага і раённых зьлётаў нездавальняючы. Сіроцінскі, Сьвіслацкі, Смалявіцкі і рад іншых р-наў зусім ганебна адстаюць у падрыхтоўцы работы па зьлётах.

Штаб пастанавіў падтрымаць ініцыятыву Менскай, Гомельскай, Полацкай, Бабруйскай організацый, якія абвясьцілі месячнік баявой зьлётаўскай трывогі, і абвясьціў па ўсёй піонэрорганізацыі месячнік баявой зьлётаўскай трывогі. Задачы месячніку: дабіцца завяршэньня павароту работы ўсёй піонэрорганізацыі на барацьбу за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне пастаноў IX і X зьездаў ЛКСМ аб ператварэньні піонэрорганізацыі ў шматмільённую організацыю з дзяцей рабочых, батракоў, колгасьнікаў і г. д.

Бабруйскія піонэры рыхтуюцца

Бабруйская райпіонэрорганізацыя ўключылася ў падрыхтоўку Усебеларускага і выклікала на соцспаборніцтва піонэрорганізацыю Гомельшчыны. Вось асноўныя пытаньні дагавору.

Да другога раённага зьлёту, які адбудзецца 10-га ліпеня, праверыць, як выконваецца дагавор з райпрофсаветам і райземчасткай.

Да ўсебеларускага зьлёту разгарнуць работу па організацыі ўдарных брыгад імя другога зьлёту піонэраў.

Піонэрскім атрадам уключыцца ў падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі;

—Кожнаму піонэратраду організаваць праверку падрыхтаванасьці ўборачных машын.

—Скласьці брыгаду па барацьбе са шкоднікамі палёў і гародаў.

— Піонэратрадам вёскі зараз організаваць атрады аховы ўраджаю.

Усім піонэрскім атрадам разгарнуць работу з неорганізаванай дзетварою. Ператварыць у жыцьцё лёзунг аб 100 проц. ахопе дзяцей працоўных піонэрорганізацыяй.

З.



Піонэры саўгасу „Гігант“ рыхтуюць насьценгазэту, прысьвечаную ўборачнай кампаніі.

„Ніводнай піонэрскай сям'і па-за колгасам“

Менская піонэрыя распачала энэргічную падрыхтоўку да другога Ўсебеларускага зьлёту піонэраў. У піонэрскія атрады прыгарадных сельсаветаў на тры дні накіраваны 2000 піонэраў, якія праводзяць конфэрэнцыі, правяраюць соцдагаворы і г. д.

Прыгарадныя атрады сваю падрыхтоўку да зьлёту праводзяць пад лёзунгам: „Ніводнай піонэрскай сям'і па-за колгасам“, за поўнае распаўсюджваньне пазыкі 3-га рашаючага і г. д.

Менгарбюро ДКО паставіла перад кожным піонэрам задачу: уцягнуць у організацыю не менш трох неорганізаваных дзяцей. У бліжэйшыя дні ў Менску будуць наладжаны масавыя вечары, мітынгі па пытаньню падрыхтоўкі да піонэрскага зьлёту.

Варэнік.

Не павярнуліся тварам да вытворчасьці

Піонэрская база фабрыкі „Вэзуві“ (Н- Беліца) адна з буйнейшых баз Гомельшчыны. У ёй налічваецца 8 піонэрскіх і 6 акцябрскіх атрадаў. Але зараз гэтая база не працуе. Б за не павярнулася тварам да вытворчасьці, яна стаіць у баку ад удзелу ў выкананьні прамфінпляну. Да другога Ўсебеларускага зьлёту піонэраў ніякай падрыхтоўчай работы не вядзецца. Партыйны і комсамольскі колектывы недаацэньваюць політычнае ролі піонэрорганізацыі. Комсамольскі колектыў вылучаў на піонэрпрацу выключна навічкоў, не знаёмых і няздольных выхоўваць ленінскую зьмену.

Сохань.

6-ці месячнік ліквідацыі політняпісьменнасьці

ЗРАБІЦЬ АДПАВЕДНЫЯ ВЫВАДЫ

За зрыў політмінімуму бюро ЦК ЛКСМБ зьняты з працы сэкратар Лагойскага РК і дадзена вымова бюро Гомельскага гаркому ЛКСМБ

На сэкратарыяце ЦК ЛКСМБ

Адно з важнейшых пытаньняў сэкратарыяту ЦК 24-га чэрвеня—гэта даклады двух райкомаў комсамолу—Лагойскага і Тураўскага—і Гомельскага гаркому аб ходзе вывучэньня політмінімуму.

Сэкратар Лагойскага РК ЛКСМБ тав. Чырэй у сваім дакладзе, уласна кажучы, ня мог нічога расказаць сэкратарыяту аб становішчы політмінімуму ў раёне. Райком комсамолу абсолютна ніякай работы па політмінімуму ня праводзіў. У выніку—паўнейшы правал ня толькі падрыхтоўкі і вывучэньня першых тэм політмінімуму, але і зімовай політвучобы.

Не адстаў ад Лагойскага райкому і Гомельскі гарком комсамолу. Ён таксама бязьдзейнічаў і не праводзіў ніякай падрыхтоўчай работы, каб ва ўсеўзброеньні сустрэць вучобу. Не праведзена вылучэньне організатараў вясковай політвучобы, не праведзены вучот політняпісьменных і малапісьменных комсамольцаў.

Сэкратар Тураўскага РК расказаў аб тым, што ў раёне толькі нядаўна распачалася якая-такая работа па вывучэньні політмінімуму. Але гэта зусім недастаткова, трэба яшчэ больш узмацніць тэмпы вывучэньня тэм політмінімуму.

Сэкратарыят ЦК пастанавіў: сэкратара Лагойскага РК за поўны правал політмінімуму зьняць з работы, абвясьціць вымову бюро Гомельскага гаркому комсамолу.

Юравіцкі РК ЛКСМ зрывае політмінімум

Пастанова IX зьезду УсеЛКСМ аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу Юравіцкай організацыяй не ажыцьцяўляецца. У 13 ячэйках раёну ніводзін політгурток не працуе.

Літаратура зусім не выпісваецца. У мінулым годзе РК КСМ сабраў 80 руб. на выпіску 6-томніка Леніна, але па сёньня нікто яго не атрымаў.

„Чырвоная Зьмена“ ў ячэйках Юравіцкага раёну не ў пашане. Майскае заданьне для раёну—260 экз., а выпісана 150. У чэрвені крывая падпіскі на „Чырвоную Зьмену“ пайшла яшчэ ніжэй—да 120 экз. Рад партыйных ячэек недаацэньвае політвучобы комсамолу. Яны не забясьпечваюць комсамольскія політгурткі кіраўнікамі. РК КСМ права-опортуністычна аднёсься да політвучобы. Ён кіруе організацыяй выключна паперамі. Практычна нічога не робіць.

Політбоі ў організацыі яшчэ не праводзіліся.

Прапрацоўка першых тэм політмінімуму ў раёне не пачата, ні гледзячы на тое, што ёсьць неабходная літаратура.

Т. Цэлко.

Політвучобай ахоплена 400 комсамольцаў

Церахаўская райорганізацыя комсамолу ў тэрмін распачала выкананьне рашэньняў IX зьезду аб ліквідацыі політняпісьменнасьці. У красавіку пачалася падрыхтоўка да політбою. Раён быў разьбіты на 10 пунктаў, у якіх павінны былі „біцца“ паміж сабою роты з 3—4 ячэек. Да гэтых рот прымацаваны політпісьменныя комсамольцы і партыйцы. Да кожнага ўзводу (адна ячэйка) былі таксама прымацаваны політычна моцныя кіраўнікі.

Ячэйкамі з красавіка былі прапрацаваны: сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б), 10 і 9 зьезды комсамолу, 6-ты зьезд саветаў і 3-ці зьезд колгасьнікаў БССР.

Політвучобай ахоплены 400 комсамольцаў і 230 чал. беспартыйнай колгаснай, бядняцкай і серадняцкай моладзі.

Не абышлося і без прарываў. Так, ячэйка саўгасу „Пролетары“ абсолютна ніякай работы па політвучобе не праводзіла.

15-га чэрвеня райком комсамолу мобілізаваў 27 комсамольцаў—настаўнікаў і накіраваў іх у новаарганізаваныя ячэйкі і тыя ячэйкі, якія за час весеннай сяўбы вырасьлі на вялікую колькасьць комсамольцаў.

Комсамолец.

Дакладваў аб адным, а справы паказваюць зусім другое

У апошніх лікбах маа ў № 119 „Чырвонай зьмены“ мы выясьнілі падборку аб 6-месячніку ліквідацыі політняпісьменнасьці вясковага комсамолу. У гэтай падборцы быў матар'ял аб ходзе політвучобы на Аршанскай організацыі. Аўтар (брыгадзір), на аснове дадзеных фактаў бюро Аршанскага райкому комсамолу, аб якіх сам сэкратар т. Лапіцкі дакладваў на бюро ЦК ЛКСМБ на ўсе 100 працэнтаў Аршаншчыну і нам прышлося ў шапцы сказаць: „Раўненьне на Воршу“.

Аўтар пісаў: „Да 1-га мая амаль усе комсамольскія ячэйкі колгасаў і саўгасаў прапрацавалі рашэньні 10 і 9 зьездаў комсамолу, пастановы 6-га зьезду саветаў аб колгасным руху, новы закон аб сельгаспадатку і г. д.“

Далей аўтар расказваў аб тым, што райком правёў па-ўдарнаму двухдзённік збору сродкаў па політмінімуму, вывучэньне 25 організатараў політвучобы. Адным словам—усё ішло, як па маслу. Больш таго, аўтар пісаў, што „праведзеная політправерка політмінімуму на 9-ці комсамольскіх ячэйках раёну паказала, што асноўная комсамольская маса ўсвоіла політмінімум...“

Аб усім гэтым, што было зьмешчана ў матар'яле дакладваў на бюро ЦК і сам сэкратар райкому т. Лапіцкі.

Аказваецца, Лапіцкі займаўся „очковтирательством“ і ўвёў усё бюро ЦК ЛКСМБ у зман. І 19-га чэрвеня бюро ЦК зноў слухала даклад брыгады брыгадзіра ЦК ЛКСМБ т. Лапоткі, які паказаў, што райком займаўся „очковтирательством“. Большасьць фактаў, аб якіх гаварыў т. Лапіцкі на першым пасяджаньні бюро ЦК і аб чым мы ў „Чырвонай зьмене“ паведамлялі, не пацьвердзіліся. На аснове гэтага, бюро ЦК ЛКСМБ прыняло наступную пастанову:

Адзначыць, што сэкратар Аршанскага РК КСМ тав. Лапіцкі на першым пасяджаньні бюро ЦК ЛКСМБ да 24-У заведама няправільна інформаваў ЦК аб сапраўдным становішчы політмінімуму па Аршанскім раёне, ЦК расцэньвае гэта з боку тав. Лапіцкага як „очковтирательство“, за што ставіць яму на від.

„Прызнаць становішча політмінімуму па Аршанскім раёне нездавальняючым, прапанаваць Аршанскаму РК ЛКСМБ пад асабістую адказнасьць тав. Лапіцкага неадкладна прыняць рад захадаў для забясьпечаньня пасьпяховага правядзеньня політмінімуму.“

Х.

ДА КАНТРОЛЬНАГА ПЛЕНУМУ ЦК.

За шматмільённы комсамол

Мілоў

I

IX-ты зьезд прызнаў „нездавальняючым ахоп саюзам рабочае моладзі“ і ў якасьці неадкладнай практычнай задачы на далейшы пэрыод паставіў задачу: „ператварэньня комсамолу ў шматмільённую організацыю ў бліжэйшы час. Выкананьне гэтай задачы патрабуе рашучага бальшавіцкага паскарэньня выкананьня лёзунгу: „100 проц. рабочае моладзі—у КСМ“.

Вясковыя організацыі зьезд абавязаў: „пашырыць сетку вясковых ячэек КСМ“, „дамагаючыся ў бліжэйшыя паўгода стварэньня ячэек пры кожным колгасе, саўгасе і МТС“.

ЦК УсеЛКСМ, правяраючы выкананьне рашэньня IX-га зьезду аб уцягненьні рабочае моладзі ў комсамол Украінскай, Ленінградзкай, Н.-Волскай і Іванаўскай організацый, адзначыў слабую работу, праробленую імі па ператварэньню КСМ у шматмільённую організацыю, зусім недастатковую работу па вярбоўцы фабзавучнікаў і асолютна недапушчальную затрымку з аформленьнем новаўступаючых.

Работу Паўночна-Каўкаскай організацыі, Заходняга Абкому і Абкому ЦЧО, па выкананьню імі рашэньняў IX-га зьезду аб росьце вясковага комсамолу і організацыі ў кожным колгасе, саўгасе і МТС комсамольскіх ячэек, прызнаў нездавальняючай.

Камітэты гэтых організацый не дабіліся жорсткага кантролю, праверкі выкананьня рашэньняў IX-га зьезду. Комсамольскія організацыі ўсё яшчэ слаба мобілізаваны на барацьбу за стварэньне ячэек комсамолу пры кожным колгасе, саўгасе і МТС.

Зусім слаба пастаўлена масавая работа ў брыгадах, групах, у полі, на вучастках.

Ацаніўшы належным чынам работу правераных організацый (а гэта ацэнка датычыць ня толькі організацый, якія дакладвалі на бюро ЦК, а большасьці комсамольскіх організацый Саюзу), Цэнтральны Камітэт даў разгорнутую праграму дзейнасьці, накіраваных на максімальна хуткае выкананьне рашэнь- IX-га зьезду.

Камітэтам вытворчых організацый ЦК прапанаваў узяць пад свой асабісты кантроль і нагляд вядучыя, „найбольш важныя галіны вытворчасьці і прадпрыемствы свайго краю, обласьці і рэспублікі, а на прадпрыемствах—найбольш важныя вучасткі вытворчасьці, вядучыя кваліфікацыі, забясьпечваючы дыфэрэнцыяваны падход к рабоце па ўцягненьню ў комсамол асобных груп рабочае моладзі (кваліфікаванае юнацтва, падлеткі, новыя кадры, дзяўчаты, нацменшасьці).

Кіраўніцтва вясковага комсамолу ЦК абавязаў: „У карацейшы тэрмін пасіліць разгортваньне масавай работы, асабліва сярод дарослага юнацтва, непасрэдна ў брыгадах, вучастках станоўках, 50-дворках, полі, у абедзеныя перапынкі, прыстасоўваючы яе да асобных груп моладзі (кадравая моладзь саўгасаў, моладзь, занятая ў МТС, пялаўпа уступіўшая ў колгас, работа сярод дзяўчат і г. д.).

Пашырыць практыку вылучэньня комсамольскіх організатараў у брыгадах, замацаваўшы кіраўніцтва імі“.

Адзначыўшы ў пастанове аб тым, што з боку паасобных комсамольскіх работнікаў раду райкомаў былі выпадкі саботажу рашэньняў IX-га зьезду па пытаньнях росту, ЦК абавязаў комсамольскія камітэты ўзмацніць барацьбу са спробамі ўзяць пад сумненьне правільнасьць рашэньняў IX-га зьезду, цьвёрда пры гэтым праводзячы ў жыцьцё ўказаньні зьезду: „У раёнах суцэльнай колектывізацыі рост саюзу павінен ісьці галоўным чынам і пераважна за лік перадавой колгаснай моладзі“; „У раёнах, яшчэ не ахопленых суцэльнай колектывізацыяй, шырока ўцягваць перадавых колгасьнікаў і беднякоў“.

З серадвякоў аднаасобнікаў, якія знаходзяцца ў раёнах яшчэ не ахопленых колектывізацыяй, прымаць у комсамол толькі лепшую, маламоцную частку, якая аддана інтарэсам партыі, рашуча змагаецца з клясавым ворагам, цьвёрда стаіць за організацыю колгасаў, актыўна ўдзельнічае ў грамадзкай рабоце, ствараючы гэтым умовы для росту колгаснага руху.

У адносінах вытворчага комсамолу ня менш ясная дырэктыва: „Трэба рашуча, па-бальшавіцку паскорыць выкананьне лёзунгу: „100 проц. рабочае моладзі—у комсамол“.

Іншая пастаноўка пытаньня, слабыя тэмпы пры правядзеньні гэтых указаньняў, бяздзейнасьць, стаўка на самацёк у росьце павінны расцэньвацца як саботаж рашэньняў IX-га зьезду, як спроба ўзяць пад сумненьне правільнасьць рашэньняў IX зьезду, як адмова ад ператварэньня КСМ у шматмільённую організацыю, адмова ад організацыйнага замацаваньня актыўнасьці працоўнае моладзі.

Другое ацэнкі, другое кваліфікацыі быць ня можа і непавінна.

* * *

Як-жа рашэньні IX-га зьезду, апошнюю пастанову бюро ЦК праламляе ў сваёй практычнай рабоце Беларуская організацыя комсамолу?

Спачатку спынімся на вытворчых організацыях.

Мілоў.



У радзе раёнаў, з-за нежаданьня няздольнасьці працаваць па-ўдарнаму, па-опэрацыйнаму зрываецца найважнейшае гаспадарча-політычнае мерапрыемства: паход за правільны ўлік у колгасах.

Ня гледзячы на катэгорычныя дырэктывы ЦК ЛКСМБ і Цэнтральнага штабу аб тым, каб усю падрыхтоўчую работу дя паходу скончыць да 23-га чэрвеня, а з 23 па 25 правесьці інструкцыйную нараду мобілізаваных комсамольцаў, каб 25 выйсьці ў масавы паход, паасобныя раёны ганебна сарвалі выкананьне гэтай дырэктывы.

Чэрыкаўскі райкамол, сэкратаром якога зьяўляецца тав. Рыбакоў, палец аб палец ня ўдарыў, каб узяцца за правядзеньне паходу.

Стара-Даросkі райкамол да 25 чэрвеня не прапрацаваў дырэктывы ЦК, а сэкратар гэтага райкому тав. Мас нават ня чытаў дырэктывы.

Халопеніцкі і Лагойскі райкамолы толькі гэтымі днямі паслалі брыгадзіраў у ячэйкі для правядзеньня мобілізацыі, але яшчэ конкрэтных вынікаў работы няма. Фактычна паход ў гэтых раёнах не пачаўся.

Сэкратар Заслаўскага райкамолу тав. Буднік, замест мобілізацыі 78 комсамольцаў для правядзеньня ўліку працы ў колгасах, мобілізаваў толькі 13 комсамольцаў настаўнікаў, якія гэтымі днямі выедуць у колгасы.

Паасобныя сэкратары райкомаў праяўляюць дэмобілізацыйныя настроі, каб кінуць работу і пайсьці ў адпачынак. Сэкратары: Цэрахаўскага РК—тав. Горнікаў і Крычаўскага—тав. Казацкі, нічога абсолютна не зрабіўшы для паходу, самавольна кінулі раён і прыехалі у ЦК прасіць адпачынак.

Мы патрабуем ад сэкратароў райкомаў Чэрыкаўскага—тав. Рыбакова, Старадароскага—тав. Маса, Халопеніцкага—тав. Клёнскага, Лагойскага—тав. Чарэя і Заслаўскага—тав. Рудніка зараз-жа па-баявому разгарнуць паводле дырэктыў ЦК комсамольскі паход. Забясьпечыць поўны посьпех правядзеньня яго і штодзённа інформаваць цэнтральны штаб.

За зрыў работы па правядзеньню паходу, сэкратарам Цэрахаўскага райкамолу т. Горнікаву і Клічаўскага т. Казацкаму, якія самавольна кінулі раён, ЦК ЛКСМБ павінен зрабіць адпаведныя організацыйныя вывады.

Сёньня другі дзень паходу. Яшчэ рад раёнаў адмоўчваецца і не інформуе цэнтральны штаб.

Уключыцца ў паход і штодзенна інформаваць штаб!

24-га пачалі работу

ВУЛА.—25. Вульскі раён уключыўся ў комсамольскі паход за правільны ўлік працадзён у колгасах. Мобілізаваны 120 чалавек. Пасьля паходу яны застануцца на месяц у колгасах для дапамогі ў рабоце.

24-га ўсе мобілізаваныя накіраваны ва ўсе колгасы раёну.

Райкамол

У поўным разгары

КОЙДАНАВА, 25. Койданаўскі райком 23-га ўключыўся ў абвешчаны ЦК ЛКСМБ комсамольскі паход за правільны ўлік працадзён у колгасах. Мобілізавана 70 чал.

24-га закончыла сваю працу інструкцыйная нарада для мобілізаваных. 25-га мобілізаваныя выехалі ва ўсе колгасы раёну.

Па ініцыятыве комсамольскай організацыі ўсе гаспадарчыя, профсаюзныя організацыі ўключыліся ў паход. Па лініі профсаюзу мобілізавана 25 чалавек—членаў саюзу. Усе ўстановы вылучаюць брыгады вучотных работнікаў.

Райкамол.

Старобінскі райком узяў курс на самацёк

21-га чэрвеня, на пашыраным пленуме Старобінскага райкому комсамолу разглядалася пастанова ЦК ЛКСМБ аб правядзеньні комсамольскага паходу за правільны ўлік працадзён у колгасах.

Пленум Старобінскага райкому комсамолу ў сваёй пастанове орыентаваўся на самацёк. Замест прыняць конкрэтную пастанову аб мобілізацыі комсамольцаў у лік 15 тысяч, з разьліку 2 комсамольцы на колгас, вынес агульную пастанову „ячэйкам разгарнуць работу".

Старобінскі раён ня ўключыўся ў абвешчаны комсамолам паход. Кіраўніцтва райкому і ячэек бязьдзейнічае. Работа на распачалася.

К.

Праз два месяцы пасьля адозвы ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу

Перабудова спажывецкай кааперацыі ня вышла з паласы падрыхтоўкі, паглыбленьня, абгаварэньня і ўвязкі

Рэйд ударных брыгад паўпрэдзтва „Комсамольской Правды" і газэты „Чырвоная Зьмена"

Звыш двух месяцаў як апублікавана гістарычная адозва ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу СССР аб спажывецкай кооперацыі. Перабудова усёй сыстэмы спажывецкай кооперацыі ёсьць важнейшая і неадкладная задача сёньняшняга дня, задача ўсіх партыйных, савецкіх і гаспадарчых організацый Савецкага Саюзу.

Рэйд ударных брыгад паўпрэдзтва „Комсамольскай праўды" і „Чырвонай зьмены", праведзены гэтымі днямі, выявіў, што гэтай рабоце не нададзены ўдарныя тэмпы, што рад організацый злачынна бязьдзейнічае ў гэтай галіне.

Матар'ялы рэйду—малюнак разгортваньня гэтай работы на сёньняшні дзень. Далей так праводзіць рэалізацыю абозвы нельга! Сёньняшні дзень павінен даць рашучы пералом.

МЦРК

рэорганізаваўся. З мэтай прыстасаваньня да работы Белкоопсаюзу, МЦРК перабудаваў усю сыстэму сваёй работы. Забясьпечаньне таварамі і продуктамі закрытых разьмеркавальнікаў адбылося ў поўнай сувязі з фабзаўмясцкомамі. Вылучаны спэцыяльны фонд для прэміяваньне ўдарнікаў.

МЦРК мае 8 прыгарадных гаспадарак, з якіх мяркуецца атрымаць 30 проц. продуктаў для забясьпечаньня гораду.

Работа комсамольскага магазыну была пастаўлена добра. Але за апошні час, калі магазын адышоў да ЦРК, работа значна пагоршылася.

МЦРК да рэалізацыі адозвы ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу прыступіў сваячасова, але конкрэтных вынікаў яшчэ няма.

Комсамольская ячэйка ЦРК да рэалізацыі адозвы конкрэтна не прыступіла і абмежавалася аднэй прапрацоўкай гэтага пытаньня на сходзе. У перабудове апарату ячэйка ня ўдзельнічала.

Менгарком ЛКСМБ

даў рад дырэктыў комсамольскім колектывам, але вынікаў да гэтага часу няма. Менгарком комсамолу не займаўся пытаньнем організацыі кроліка-адкормачных пунктаў на прадпрыемствах, выпала з пункту дзейнасьці гаркому пытаньне падрыхтоўкі кадраў для спажывецкай коопэрацыі.

Менгарком ЛКСМБ зусім не займаўся пытаньнем організацыі груп і брыгад па барацьбе з затаварваньнем і організацыі ўдарных комсамольскіх разьмеркавальнікаў.

Гарком не правярае выкананьня дадзеных ім дырэктыў.

НАРКАМСНАБ

ня толькі не падрыхтаваўся да прыёму прамысловых прадпрыемстваў ад Белкоопсаюзу, а нават ня ведае аб іх існаваньні.

Комсамольская ячэйка пры Наркамснабе па рэалізацыі адозвы нічога не зрабіла, акрамя агульнай яе прапрацоўкі. Комсамольская ячэйка ня цікавілася рэалізацыяй адозвы па перабудове сыстэмы спажывецкай коопэрацыі.

„Комунар"

прыступіў да рэалізацыі адозвы наступным чынам: На бюро комсамольскага колектыву заводу абгаварвалася гэта пытаньне.

Асаблівага затаварваньня ў магазыне заводу „Комунар" няма.

Заводзкая грамадзкасьць слаба мобілізавана на рэалізацыю адозвы. Шматтыражка „Комунаравец" вельмі мала займаецца гэтым пытаньнем. Ніхто ня цікавіцца пытаньнем організацыі кролікаадкормачных пунктаў, якія павінны адыграць значную ролю ў палепшаньні рабочага забясьпечаньня.

„Бальшавік" і Зав. ім. Варашылава

не прыступілі да прапрацоўкі і рэалізацыі адозвы па перабудове спажывецкай коопэрацыі. Сэкратар колектыву комсамолу заводу „Бальшавік" нават ня ведае аб існаваньні гэтай адозвы.

Ня пастаўлена падрыхтоўка коопэратыўных кадраў. Комсамольскія колектывы заводу Варашылава і „Бальшавік" да гэтага часу ніводнага комсамольца не паслалі на коопэратыўную работу.

Колектывы ніякай работы не правялі па організацыі комсамольскіх груп у ЦРК, у той час, калі ў закрытым разьмеркавальніку заводу „Бальшавік" працуюць 3 комсамольцы і там магчыма організаваць комсамольскую групу.

Белдзяржкіно

вылучыла спэцыяльнага работніка, які распрацаваў рад мерапрыемстваў па ўдзелу Белдзяржкіно ў перабудове коопэрацыі і рэалізацыі адозвы.

У першую чаргу будуць абслугоўвацца колгасы, саўгасы і машынатрактарныя станцыі.

Комсамольская ячэйка Белдзяржкіно не правяла ніякай работы па гэтаму пытаньню.

У рэйдзе ўдзельнічалі т. т. Г. Ліўшыц, Бутрымовіч, Новадворац, Блозман, Каждан, Лібін, Краўцоў, Райчык і інш.

БЯЗ УЛІКУ НЯМА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ

Увядзеньне зьдзельшчыны знаходзіць сваё конкрэтнае адлюстраваньне ў ацэнцы работы ў працаднёх. Ад таго, як пастаўлены ўлік працадзён і як запіс у працоўную кніжку колгасьніка, у значнай меры залежыць практычны посьпех зьдзельшчыны. Таму ўлік працы ў колгасах зьяўляецца не толькі тэхнічнай, але і агромністага значэньня палітычнай задачай.

Пры вырашэньні гэтай задачы сустракаецца жорсткая клясавая барацьба. Кулак выступае, прапагандуе прынцыпы „ўраўнілаўкі" ў самых рознастайных формах. Задача колгасных ячэек комсамолу ў тым, каб пад кіраўніцтвам партыі зламаць вылазкі кулацтва, выкрыць опортунізм ў практыцы організацыі колгаснае працы і дабіцца дакладнага і сваячасовага запісу работы колгасьніка ў яго працоўную кніжку.

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх рашэньнях аб задачах уборачнай кампаніі даў дырэктыву: „Забясьпечыць ва ўсіх без выключэньня колгасах да пачатку ўборкі скончэньне падліку працадзён, выпрацаваных кожным колгасьнікам за час пасеўнай і прапалачнай кампаніі".

Дагэтуль толькі пяць ці шэсьць процантаў колгасаў выдалі колгасьнікам працоўныя кніжкі. Дагэтуль толькі ў 2,2 проц. колгасаў вядзецца запіс працадзён у працоўныя кніжкі. Дагэтуль з-за бясчыннага ўліку колькасьці і якасьці работы колгасьніка прынцыпы зьдзельшчыны ў некаторых колгасах звараочваюцца (супутры-брыгадная „ўраўнілаўка" і інш.), а не значэньне ў справе організацыі працы колгасьніка паніжаецца. Цяпер, калі ў асноўным закончыў сеў і калі падрыхтуюцца прапалачнай работы, завяршэньне ўліку працадзён мае першачарговае значэньне для посьпеху ўборачнай кампаніі.

Комсамол Беларусі абвясьціў з 25 чэрвеня па 10 ліпеня комсамольскі паход за правільны ўлік працадзён у колгасах.

Гэты паход павінен выліцца ў масавы і баявы паход за ўзорную пастаноўку ўліку працы ў колгасах, за хутчэйшае выкананьне дырэктывы пленуму ЦК УсеКП(б).

Давесьці колгасьнікам перавагу зьдзельшчыны на прыкладах пасеву і прапол кі, паказаць сапраўдных ударнікаў у колгасе, выкрыць гультаёў і дэзорганізатараў колгаснай вытворчасьці—такая задача колгасных ячэек комсамолу ў гэтым паходзе.

ЦК ЛКСМБ абавязаў усе раённыя і комсамольскія організацыі мобілізаваць ня менш 15 тысяч лепшых комсамольцаў на правядзеньне ўліку працадзён у колгасах. На мобілізаваных комсамольцаў ускладзена адказнасьць за наладжваньне дакладнага ўліку працадзён кожнага колгасьніка па колькасьці і якасьці, за даведзеньне да кожнага колгасьніка працоўнай кніжкі. Аднак, для актыўнай дапамогі мобілізаваным комсамольцам трэба прыцягнуць усе сілы колгаснай ячэйкі і усю перадавую колгасную моладзь і лепшых ударнікаў. Трэба на працягу паходу дабіцца выдачы працоўных кніжак усім без выключэньня колгасьнікам.

Комсамольскія ячэйкі павінны організаваць тэхнічную консультацыю па пытаньнях уліку працы ў колгасах. На працягу паходу трэба выявіць брыгады з лепшай пастаноўкай уліку і распаўсюдзіць гэты вопыт на ўсе зьвеньні колгасу.

„Бяз уліку немагчыма існаваньне колгасу, як буйнай гаспадаркі" (з рашэньня пленуму ЦК УсеКП(б). Бяз уліку няма зьдзельшчыны. Улік працы ў колгасах павінен быць узьняты на прынцыповую політычную вышыню. Вясковы комсамол работу па ўліку працадзён колгасьнікаў павінен паставіць у цэнтры сваёй увагі, як важнейшае зьвяно організацыі працы ў колгасе. **Г. С.**

НЕ АГАЛЯЙЦЕ ФРОНТ ТАРПЯНАГА ДОНБАСУ!

Мобілізацыя комсамольскай тысячы павінна быць скончана ў бліжэйшыя дні. Дэзэртыраў з торпазаводаў—гнаць з комсамолу

Урокі койданаўскага кіраўніцтва павінны ўлічыць усе райорганізацыі

Да гэтага часу не дасягнуты пералому рабоце торпазаводаў. За апошнія дэкады ніводзін торпазавод ня выканаў свайго прамфінпляну. Лічбы торпаздабычы па БССР гавораць аб наяўнасьці вялікага прарыву.

Ужо прайшлі ўсе тэрміны, а рашэньні ЦК аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў на торпарапрацоўкі ня выканаы. Ёсьць факты дэзэртырства з тарпянага фронту мобілізаваных комсамольцаў.

Надзвычайна дрэнна стаіць справа з разгортваньнем соцспаборніцтва і ўдарніцтва на торпазаводах. Большасьць комсамольскіх ячэек у гэтай галіне не праяўляюць ніякай ініцыятывы.

Рашэньне сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ па дакладах Койданаўскага, Полацкага, Чашніцкага РК ЛКСМБ зьяўляецца суровым папярэджаньнем для ўсіх райкомаў ЛКСМБ.

Мы павінны прыйсьці да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ з поўным выкананьнем узятых на сябе абавязкаў.

Даць торпазаводам лепшых комсамольцаў

Плян торпарапрацовак на заводзе „Новая Беларусь“ (Бабруйск) выкананы ўсяго на 36 проц. Адна з прычын невыкананьня прамфінпляну—гэта недахоп у рабочай сіле.

Аднак, Бабруйскі РК ЛКСМБ да гэтага часу ня выканаў разьвёрсткі, дадзенай ЦК па мобілізацыі комсамольцаў на торпазаводы. Ен падышоў да гэтай важнейшай работы надзвычайна формальна, нават яшчэ і зараз не праверыў, як выканана разьвёрстка па ячэйках.

Паасобныя ячэйкі пасылаюць на торпзаводы самых слабых па стану здароў'я комсамольцаў. Прапрацаваўшы два тры дні, яны кідаюць работу. Бываюць выпадкі, што мобілізаваныя комсамольцы дэзэртуюць з работы (Верасьнёўская ячэйка і інш.).

На заводзе слаба разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Паасобныя комсамольцы плятуцца ў хвасьце адсталых рабочых. Да гэтага часу не організавана комсамольская ячэйка на заводзе.

Неабходна прыняць рашучыя захады да хутчэйшай ліквідацыі прарываў на торпзаводзе „Новая Беларусь“. Райком павінен дабіцца 100 процантнага выкананьня разьвёрсткі ЦК ЛКСМБ па мобілізацыі комсамольцаў і прыняць рашучыя меры да тых комсамольцаў, якія дэзэртуюць з тарпянага фронту.

Ф. Хазанаў

Ліст у „Чырвоную Зьмену“

У Менску ўсе лічаць, што Шклоўскі тарпяны завод ужо даўно працуе. На справе зусім ня так. Завод яшчэ не прыступіў да працы. 17-га чэрвеня прыбыла адна машына і больш ніякіх мэханізмаў няма.

Завод—у такім стане, што нельга сказаць, калі ён пачне працаваць. Белтроп яшчэ толькі распрацоўвае проэкты каналаў для супуску вады і усёй здабычы.

Ясна, што завод ня зможа своячасова выканаць свае заданьні.

Шклоўскі торпазавод павінен як мага хутчэй увайсьці у строй змагароў за выкананьне пляноў торпаздабычы.

Брыгадір ЦК ЛКСМБ **А. Сямчук.**

Гнаць дэзэртыраў з комсамолу

З 25-ці комсамольцаў, якія павінны былі прыбыць у парадку мобілізацыі на торпазавод імя „Першага Мая“ (Чашнікі), прыбыло ўсяго 9.


Але комсамольцы Ралас, Апухаў, Бабаедаў, Лапіцкі дэзэртавалі з торпзаводу. Меры да іх ня прыняты.

Райком комсамолу пры мобілізацыі падышоў формальна да адбору кандыдатур і прыслаў нявытрыманых комсамольцаў.

Г. Палей.

Без перамен

ВІЦЕБСК, 18. (БЕЛТА). Торпзавод „Чырвоны тарпянік“ за першую дзесяцідзёнку чэрвеня выканаў плянавае заданьне на 63,8 проц. Асноўная прычына недавыкананьня пляну ў тым, што паасобныя арцелі недавыканалі сваіх норм. Як і раней адсутнічае культурна-масавая работа і работа з ударнікамі. Гарком комсамолу дагэтуль накіраваў на завод толькі двух комсамольцаў.



Рабочы пасёлак торпазаводу Міхановічы

Скарыстаць урок

За саботаж рашэньняў ЦК ЛКСМБ Клябанаў зьняты з працы

Пастанова Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 23-га чэрвеня 193 па дакладах Койданаўскага, Полацкага, Чашніцкага, РК ЛКСМБ аб ходзе мобілізацыі на торпарапрацоўкі

Адзначыць, што большасьць райкомаў ЛКСМБ недапушчальна адносіцца да выкананьня рашэньняў ЦК аб мобілізацыі 100 комсамольцаў на торпазаводы. Сэкратарыят красьлівае гэта, як ігнараваньне і саботаж рашэньняў ЦК.

Выходзячы з гэтага, пастанаўляе:

1. За ігнараваньне і невыкананьне пастановы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі комсамольцаў на торпарапрацоўкі, сэкратара Койданаўскага РК КСМ тав. Клебанава з працы зьняць.

За няпоўнае выкананьне разьвёрсткі ЦК, сэкратару Чашніцкага РК КСМ тав. Юнкевічу абавясьціць вымову. Прапанаваць яму выканаць разьвёрстку да першага ліпеня.

Сэкратару Полацкага РК КСМ тав. ...азанаву ў дзесяцідзённы тэрмін выканаць раней дадзеную разьвёрстку ЦК у колькасьці 20 чалавек і паслаць іх на торпазавод „Вобаль“ (Вулскі раён).

2. У апошні раз папярэдзіць усіх сэкратароў РК, што ў выпадку няпрыняцьця тэрміновых мер да выкананьня разьвёрсткі ЦК аб мобілізацыі комсамольцаў на торп ЦК будзе вымушаны прыняць меры організацыйнага парадку.

3. Даручыць масава-экономі наму аддзелу наладзіць сталы кантроль за выкананьнем райкомамі мобілізацыі на торпарапрацоўкі.

4. „Чырвонай Зьмене“ узяць пад жорсткі абстрэл райкомы комсамолу, якія саботуюць рашэньні ЦК аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў на торпарапрацоўкі.

НЯ ЗЬНІЖАЦЬ ЗДАБЫЧЫ ТЭМП!



22-га чэрвеня дало значнае павялічэньне здабычы торпу. Усяго здабыта за гэты дзень 3080,8 тон торпу, што складае 37,6 проц. сутачнага заданьня. Такім чынам, сэзонны плян выкананы на 11,9 пр., а ўсяго здабыта 83.626, 6 тон торпу, што складае 30,7 каляндарнага пляну.

Патрэбна ўмяшаньне Вушацкага РК КП(б)Б

За апошнюю дэкаду на торпазаводзе імя Даўмана (Вушацкі р.) дзённае заданьне выконваецца фармовачнымі машынамі на 45 50 проц. у сярэднім. Былі дні, калі машыны рабілі прастоі па 4-6 гадзін з-за тэхнічнага недагляду.

Толькі зараз парткам абвясьціў двухтыднёвік штурму прарываў. Аднак, патрэбных вынікаў няма.

Комсамольская ячэйка заводу, якая налічвае 32 члена, стаіць у баку ад заводзкага жыцьця, ня кіруе ўдарніцкім рухам.

Мобілізаваныя комсамольцы не скарыстоўваюцца непасрэдна на торпаздабычы.

Прапрацоўкі і абгавареньня тэзісаў сэкцыі торпу не праводзілася.

Усе гэтыя факты настойліва патрабуюць умяшаньня Вушацкага райкому партыі і райкому комсамолу.

І. Тарэян к

Бюро Аршанскага РК ЛКСМБ паведамляе

Адкрыты ліст ячэйкі Асінторпу да ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены“, зьмешчыны 4-VI-г. г. запатрабаваньнямі, высунутымі перад радам організацый, зьяўляецца поўнасьцю правільным, бо прамфінплян на 20-е чэрвеня ў машына-фармовачным цэху выканан усяго па 20 проц., а ў фрэзэрным—на 1 пр.

Ячэйка ЛКСМБ Асінторпу не мобілізавала кожнага комсамольца і масу моладзі на ўдарныя тэмпы працы і разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва.

Бюро РК прызнае політычную памылку з свайго боку ў тым, што яно не прыняло своячасовых захадаў, каб дапамагчы ячэйцы ЛКСМБ ліквідаваць прарывы на Асінторпе, дзе комсамол і рабочая моладзь адыгрывае рашаючую ролю. Бюро РК лічыць недапушчальным факт адносін колектыву Белдрэс'у, які не аказаў ніякай дапамогі Асінторпу, за што абвяшчае бюро колектыву Белдрэс'у вымову.

Бюро РК просіць ЦК ЛКСМБ уздзейнічаць на райкамолы, якія ня выканалі разьвёрсткі ЦК ЛКСМБ па мобілізацыі комсамольцаў на Асінторп.

З мэтай лепш ажыцьцявіць дырэктывы аб аказаньні дапамогі і аб кантралі за работай, комсамольскую ячэйку Асінторпу падпарадкаваць непасрэдна раённаму камітэту, вылучыўшы яе ў самастойную ячэйку.

(З пастановы бюро РК ЛКСМБ ад 15-га чэрвеня).

Ад рэдакцыі.

Зьмяшчаючы вынятккі з пастановы бюро Аршанскага РК ЛКСМБ рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ чакае матар'ялу аб конкрэтных захадах па ажыцьцяўленьню гэтай пастановы і адначасова з гэтым адказу ЦП Саюзу тарпяна-сланцовых рабочых, Белрадыё цэнтру, заводу Варашылава і ўсім тым, да каго зьвярталіся з заклікам комсамольцы Асінторпу.

Папраўка

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты на 3-й старонцы ў пастанове сакратарыяту ЦК КП(б)Б дапушча а грубая памылка Замест слова: „інстанцыя“ надрукавана „інструкцыя“

Як мы будуем?

Твар да твару нашыя аграмадныя дасягненьні і нашыя недахопы.

Твар да твару: ударнікі—творцы штодзённых перамог і вінавайцы недахопаў—героі старынкі.

Новае прыходзіць на пабудову асьцярожна, у аглядку, хаваецца пад кучы накіданай на рыштаваньні цэглы, пад дошкі рыштаваньня, што ляжаць на зламаных бочках з-пад цэманту.

Пабудова абутковай фабрыкі—узорная, ударная комсамольская пабудова. Будуе ўдарны колектыў, у большасьці моладз комсамольцы.

Ужо скончана праца на апошнім перакрыцьці. Па загаду прараба пабудовы маладога спэцыялістага тав. Фішкіна была зьнята апалубка. На пабудову прышла тэхнічная камісія. Паважаны інжынэр малатком ударыў па шэрым бэтоне: ад лёгкага ўдару пасыпаліся каменьчыкі, пясок.

Апалубка была зьнята заўчасна. Цэмант яшчэ ня схапіўся, ня прыступіў да выкананьня сваіх абавязкаў, калі ён робіцца цьвёрдым, моцным. Пад перакрыцьце зноў стаўлялі падпоркі, падбівалі дошкі.

Праца затрымалася.

На пабудове казалі:—Засыпаўся. У трэсьце паціскалі плячыма;—Ну што-ж. Малады.

А ці так яно? Пытаньне, якое амаль ніхто не задаваў.

Бэтон стаіць у апалубцы ўжо доўгі час. Апалубка перашкаджае далейшаму ходу працы. Трэ'было-б зьняць яе, а тады і кроквы класьці можна. Прараб парашыў зьняць.

Стары спрактыкаваны спэц парашыў-бы пачакаць, каб чаго ня здарылася, хай лепш пастаіць.

Звычайна бэтон стаяў у апалубцы лішнія дні, тыдні. Праца затрымлівалася. Ніхто не рызыкаваў; навошта, пасьпеем.

Фішкін рызыкнуў, каб хутчэй рушыць працу.

І я вышла.

Чаму?

Бэтон-хэмічнае злучэньне. Моц бэтону залежыць не ад таго, што больш усыплеш цэманту, а ад дакладнай дозіроўкі.

Уявеце сабе хэміка, які сыпе прэпараты з мяха ў рэторту. Памяшае кіем, крыху паварыць і гатова. Тут так робяць. Гэта гучыць анэкдотам, але гэта так.

На пабудове ня прытрымліваюцца правіл дозіроўкі бэтону. Нават ня ўсюды карыстаюцца простай драўлянай скрынкай, каб усыпаць адну частку цэманту, дзьве жарствы і г. д. Чорнарабочы, які ў пяршыню працуе ля бэтонамешалкі, сыпе проста лапатай.

Ніякіх прылад на пабудове. Ніякіх іспытаў, ці бэтон схапіўся, як ідзе хэмічны процэс.

Вынікі відавочны. З-за славутай консэрватыўнасьці, нярухавасьці, якую некаторыя імкнуцца спраўдзіць, зрабіць неадрыўнай якасьцю будаўнікоў аграмадныя страты, затрымка тэмпаў.

Мы павінны будаваць інакш.

Ніякай палёгкі. Ад імя грамадзкасьці мы высоўваем перад пабудовай патрабаваньне максімальнай рацыяналізацыі будаўніцтва.

Даць бой усяму таму, што перашкаджае будаўніцтву. Ужыць новыя, рэволюцыйныя мэтады працы, каб злучыць ударныя тэмпы з новай тэхнікай і даць тэмпы плюс якасьць.

За гэта мы павінны, за гэта мы будзем разам з усім будаўнічым колектывам змагацца.

А С-п.

Адказны рэдактар **МІХ. ПЛАТАЎ.**

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўліт ел № 599